# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

***№ 5 (79) СТУДЗЕНЬ 2022***

**Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно”**




У мэтах фарміравання аб'ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў указ аб аб'яўленні 2022 года **Годам гістарычнай памяці**.

# ПТУШКА ГОДА БЕЛАРУСІ

**Птушкай 2022 года выбрана патрыётка Палесся, паляшучка – белая сініца (рус. – белая лазоревка) – невялікая прыгожая пеўчая птушка, якая жыве ў нас толькі на Палессі. Менавіта за яе кандыдатуру прагаласавалі сябры Аховы птушак Бацькаўшчыны. Яна змяніла леляка – птушку 2021 года.**

**Што ж гэта за птушка?**

1. Белая сініца мае яшчэ адну назву – князёк, сапраўдны князёк сярод сініц! Гэта адзін з сямі відаў сініцавых.

2. Уключана ў Чырвоную кнігу Беларусі яшчэ з першага выдання. Колькасць у Беларусі апошні раз ацэньвалася ў 2015 годзе ўсяго ў 500-800 пар.

3. Птушка меншая за вераб'ёў: вага да 16 г, размах крылаў да 21 см. У кладцы да 11 яек. Два тыдні птушкі іх наседжваюць і столькі ж выкормліваюць птушанят.

4. Гняздуе ў Беларусі і Украіне толькі ў Палессі, нават узімку не пакідае яго. Птушкі канцэнтруюцца вакол Прыпяці і на яе прытоках. Тут белая сініца ўтварае ізаляваную папуляцыю. Асноўны ж арэал расцягнуўся паласой ад Масквы да Японскага мора.

5. Для гнездавання птушцы патрэбны дубровы, чорнаалешнікі і старыя вербалозы, якія ўвесну заліваюцца вадой у час паводкі. Таму менавіта вакол Прыпяці птушкі і жывуць і нідзе болей на захад, поўнач ці поўдзень.

6. Пры ўтварэнні пары самец робіць адмысловы рытуал – корміць самачку.



7. У красавіку, калі ў белай сініцы пачынаецца гнездавы сезон, яе лёгка заўважыць: самец вельмі актыўна спявае на сваім участку. А вось у час выкормлівання птушанят белыя сініцы паводзяць сябе як партызаны — хаваюцца.

8. Гняздо робіць, як і іншыя сініцавыя, у дупле, вядомыя выпадкі гнездавання ў шчылінах дамоў. Не цураецца людзей і часта селіцца ў населеных пунктах. З задавальненнем займае сінічнікі – штучныя дуплянкі. Гнёзды часта робіць нізка, часам усяго на паўметра ад зямлі!

9. Узімку яе можна пабачыць у густых зарасніках трыснягу па поймах рэк. Яна расшчапляе моцнай дзюбай цвёрдыя сцёблы трыснягу і парасонавых раслін.

10. Белая сініца — адзін з самых папулярных відаў беларускіх птушак за мяжой, шмат турыстаў прыязджае да нас на Палессе, каб пабачыць менавіта яе.

# ПРАФЕСІЯ МАЁЙ МАРЫ

**У хуткім часе выпускнікі школы будуць вымушаны зрабіць вельмі важны крок у сваім жыцці – выбраць будучую прафесію. Для выпускнікоў педагагічнай групы гэты выбар ужо зроблены. Апошнія два гады яны мэтанакіравана займаюцца ў профільным класе, каб ажыццявіць сваю запаветную мару – стаць настаўнікам.**

**Зусім нядаўна вучань 11 класа АЛЯКСАНДР МАЛАШКЕВІЧ пасправабаваў свае сілы на ніве педагагічнай дзейнасці – даў адкрыты ўрок па вучэбным прадмеце «матэматыка» у 2 «Б» класе. У гэтым навучальным годзе Аляксандр стаў пераможцам раённага этапа абласнога творчага конкурсу «Шлях у прафесію» ў намінацыі «Эсэ «Прафесія маёй мары»».**

**Сёння мы друкуем гэта эсе, каб лепш даведацца, пра што думае, чым кіруецца малады хлопец пры вызначэнні свайго далейшага прафесійнага лёсу.**

Перед выбором профессии я уже не стою: он уже мною сделан. И сделан в пользу педагогической сферы. Но подойдём ли мы друг другу? Сомнения, и немалые, всё-таки остались.

У одного известного учёного-психолога Альбрехта Маслоу я нашёл высказывание о том, что каждый счастливый человек непременно вовлечён в какое-то важное, ценное для него дело, которому он предан. Проще говоря, таким людям повезло встретиться со своим призванием, то есть с возможностью стать именно тем, кем они не только хотят, но и могут быть. Чего я хочу, знаю. Но смогу ли? Как говорится «быть или не быть?» Гамлетовский вопрос тревожит и меня.



Вот поэтому-то, считаю, не стоит говорить о будущей профессии пафосно, с придыханием. В её глубины я ещё недостаточно погружён. А что там, в этих глубинах? Какие подводные камни ждут? Мечта – это, конечно, красиво, романтично, и, не скрою, она есть. Но все же для меня главное здравый смысл, который определяет мои действия и поступки. Так что о профессии учителя я мечтаю мало – просто к ней готовлюсь уже сегодня.





Я понимаю, что никто ничему не может научиться у человека, который не нравится. Следовательно, мне, будущему учителю, нужно думать о собственном имидже и прямо сейчас начать создавать его. А это и внешний вид, и ментальная составляющая (в её основе мой духовный мир, знание предмета, который буду преподавать и, бесспорно, расположенность к детям, которых буду учить), а также моя речь, моё умение общаться, язык моего тела. Начнёшь с этой позиции оценивать себя – и вопросы, вопросы…

Ещё меня волнует, смогу ли я соответствовать писаным и неписаным правилам педагогической этики.

Быть, например, хорошим примером для своих воспитанников, авторитетом для них. А требовательность? Как найти «золотую середину» между ней и доверием к детям, уважением к их личности, соблюсти справедливость и не оказаться на позиции слабого? А получится ли всегда поступать по совести? Как сделать, чтобы она оставалась незапятнанной?

Особенно меня тревожит вот что: сумею ли я в работе с детьми держать эмоции в узде или, наоборот, играть ими для пользы дела, не выходя за рамки дозволенного? Да и где эти рамки? Смогу ли при этом просчитать, предвидеть последствия моих действий? Ведь своих учителей я оцениваю прежде всего с таких позиций.

Общее представление о психологических и педагогических процессах, которыми живёт школа, у меня есть. Этому учат на факультативных занятиях профессиональной направленности «Введение в педагогическую профессию». Я же хочу одного – профессии, любимого дела на всю жизнь, чтобы не жалеть потом, что пошёл неверной дорогой. Перед моими глазами множество примеров успешных, состоявшихся учителей, которые без высоких слов и пламенных призывов делают работу действительно огромной для страны важности. В минуты сомнения я вспоминаю о них и говорю себе: «Как же ты узнаешь, что тоже можешь это, если не попробуешь?» И я попробую. Ведь хорошее начало – половина дела. А начало уже есть.

**Александр Малашкевич**

# "ПРЫЙШЛІ КАЛЯДАЧКІ!"

**У цёмныя зімовыя вечары нашы продкі збіраліся ўсёй сям’ёй, каб адзначыць самае галоўнае і ўрачыстае свята — Каляды. Беларускія традыцыі святкавання Каляд прайшлі праз стагоддзі і захаваласяда нашых дзён, у некаторых мястэчках краіны яны і дагэтуль развіваюцца і ўзбагачаюцца.**

**Што гэта за свята – Каляды?**

Назва свята — Каляды — мае язычніцкія карані. Лічыцца, што яна ўтварылася ад слова «кола», што азначае «сонца». Традыцыйна Каляды звязваліся з днём першага зімовага сонцастаяння і сімвалізавалі пачатак новага году — як сонечнага, так і сельскагаспадарчага. Святкаваць пачыналі 25 снежня, а заканчвалі 6 студзеня. Але калі на нашыя землі прыйшло хрысціянства, свята ўвабрала ў сябе новыя рысы: пачаткам Каляд стала Раство, а канцом — Вадохрышча. Зараз каталікі святкуюць Каляды па старых датах, а праваслаўныя вернікі адзначаюць свята з 6 па 19 студзеня.



У гэты дзень калядоўшчыкі таксама наведалі са сваім прадстаўленнем аддзел нарыхтовак Бярэзінскага філіяла Мінскага абласнога спажывецкага таварыства «Светалуч».



13 студзеня, у нашай школе адбылося мерапрыемства "Прыйшлі Калядачкі!", святкаванне якіх стала добрай традыцыяй у нашай школе. Пад кіраўніцтвам класнага кіраўніка Н.С. Міхалёвай вучні 7 "А" класа падрыхтавалі святочную праграму. Вясёлыя калядоўшчыкі ў яркіх касцюмах падарылі ўсім прысутным добры настрой, пажадалі здароўя, шчасця, багацця і ў сваю чаргу атрымалі ад іх пачастункі.



Усім чытачам мы настойліва раім у будучым годзе не застававацца ўбаку ад святкавання Каляд! Адчуйце цёплую казачную атмасферу свята, паспрабуйце ўявіць сябе тым самым беларусам ці беларускай з мінулага, што ўвесь год з захапленнем чакалі Каляд, каб павесяліцца і смачна паесці!

***Калядоўшчыцы Анастасія Верас і Ксенія Камароўская***

# «Я ВЫКОНВАЮ ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ!»

24 студзеня на базе Бярэзінскай гімназіі адбылася 15-ая раённая алімпіяда па Правілах дарожнага руху сярод школьнікаў раёна. Традыцыйна ў ёй бралі ўдзел вучні 5-7 класаў.

Абавязковую заліковую праграму складалі індывідуальнае і каманднае вырашэнне задач па Правілах дарожнага руху. Акрамя таго, школьнікі мелі магчымасць прагаласаваць за найбольш упадабаны імі відэаролік, прысвечаны бяспецы на дарогах.

Пераможцам алімпіяды стала **каманда нашай школы. У яе склад увайшлі: Антон Буяльскі, Анастасія Мельнікава і Мікіта Самец. Мікіта стаў пераможцам у асабістым першынстве Другое месца прысудзілі за тэматычны відэаролік.** Дзеці атрымалі дыпломы, памятныя падарункі і прысмакі.




4 лютага ў Сярэдняй школе №4 г. Стоўбцы прайшла **17-ая алімпіяда па правілах дарожнага руху сярод вучняў устаноў адукацыі Мінскай вобласці.**

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі галоўнае ўпраўленне па адукацыі і ўпраўленне ДАІ УУС Мінскага аблвыканкама. На жаль, каманда з Бярэзіншчыны не заняла прызавых месцаў у камандным і асабістым заліку.

**Затое каманда нашай школы стала пераможцам творчага конкурсу відэаролікаў «Я выконваю правілы дарожнага руху!».**




Заслужаны поспех і прызнанне гэтага роліку – у зладжанай працы ўсіх, хто прымаў у ім удзел, – вучняў, настаўнікаў і бацькоў. **Галоўныя ролі выканалі вучні 2 "А" класа Павел Паскробка і Ілья Трапянок.** Акрамя таго, у роліку зняліся **настаўнікі А.Ю.Кузіна, Д.М.Якаўлеў, вучні У.Лапыцька, А.Макарэвіч, А.Швед** і інш. Верш напісаў тата Пашы – **Аляксандр Паскробка.** Ідэя і творчае ўвасабленне належыць **Марыі Мікульчык і Алене Ждановіч.**

**Віншуем пераможцаў!**

**Паглядзець ролік**

**УСІМ ЧЫТАЧАМ НАШАЙ ГАЗЕТЫ ЖАДАЕМ БЫЦЬ УВАЖЛІВЫМІ НА ДАРОЗЕ І ВЫКОНВАЦЬ ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ!**

# АДМЕТНЫЯ ПАДЗЕІ СТУДЗЕНЯ

20 студзеня ў працоўным калектыве прайшоў **адзіны дзень інфармавання.** Тэматыка сустрэчы: "Аб рэалізацыі Комплекснага плана мерапрыемстваў, накіраваных на прыняцце эфектыўных мер па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў, прафілактыцы іх спажывання, у тым ліку сярод дзяцей і моладзі, сацыяльнай рэабілітацыі асоб, хворых на наркаманію, у Мінскай вобласці"; "Забеспячэнне пажарнай бяспекі ў зімовы ацяпляльны перыяд". Асаблівая ўвага на сустрэчы была нададзена **тэме "Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь як аснова адзінства нацыі і захавання гістарычнай памяці народа".** Сярод выступоўцаў: дырэктар УА Абрамовіч С.В., старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі Баброўская Г.У.

20 студзеня ў нашай школе адбыўся **бацькоўскі сход на тэму "Узаемадзеянне сям'і і ўстановы адукацыі як крыніца і важны механізм выхавання адказнага, творчага, законапаслухмянага грамадзяніна"**. Дырэктар школы Абрамовіч С.У. расказала аб формах і метадах работы ва ўстанове адукацыі, накіраваных на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, аб тым, якія мерапрыемствы садзейнічаюць фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў, гонару і павагі за сваю краіну, малую радзіму.





Гэта і мерапрыемствы ў рамках праекта «ШАГ» з удзелам спецыялістаў розных галін, штогадовыя школьныя агляд строю і песні, конкурс інсцэніраванай песні «Песня ў ваенным шынялі», наведванні вучнямі знакавых для Беларусі месцаў памяці: мемарыяльных комплексаў «Хатынь», «Курган Славы», «Усакіна», «Буйніцкае поле», а таксама экскурсіі ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на найбольш буйныя прадпрыемствы краіны.

У сваім выступленні Святлана Віктараўна падкрэсліла, што толькі ва ўзаемасувязі педагогаў і бацькоў, прыкладаючы сумесныя намаганні, вырасце сапраўдны грамадзянін, адказны за свой лёс і лёс сваёй краіны.

Адным з ключавых момантаў мерапрыемства стала **абмеркаванне праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь** з удзелам нам.старшыні Бярэзінскага райвыканкама Навіцкага В.М., начальніка ўпраўлення па адукацыі, спорце і турызме Бярэзінскага райвыканкама Цітовай А.А., галоўнага ўрача ДУ «Бярэзінскі раённы цэнтр і эпідэміялогіі» Буйніцкага В.С. Сустрэча прайшла ў форме дыялогавай пляцоўкі. Кожны з выступоўцаў падкрэсліў важнасць паправак, якія будуць садзейнічаць далейшаму развіццю Беларусі як суверэннай дзяржавы.

# ПРАЦА + ПОСПЕХ = ПРЫЗНАННЕ

**Вучаніца нашай школы Анастасія Швед стала ўдзельніцай абласнога конкурсу «Вучань года Мінскай вобласці».**



*А.Швед другая справа*

Фінальнае мерапрыемства рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» адбылося на Міншчыне 14 студзеня 2022 года. Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу «Вучань года Мінскай вобласці – 2021» праводзіцца ў цэнтральным рэгіёне сёмы раз. Швед Анастасія, вучаніца нашай школы, пераможца раённага конкурсу на званне лепшага вучня ў намінацыі «Вучэбная дзейнасць", прадстаўляла Бярэзінскі раён.

Удзельнікаў мерапрыемства цёпла вітаў намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Іван Станіслававіч Маркевіч. Ён адзначыў: «Больш за чвэрць стагоддзя праходзіць дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». За гэтыя гады яна ператварылася ў сапраўдны марафон дабра, сімвал бескарыслівасці і яднання людзей у сучаснай гісторыі Беларусі». На памяць аб сустрэчы ў Анастасіі засталіся яркія ўражанні пасля прагляду тэатралізаванага навагодняга паказу, добры настрой ад агульнай атмасферы свята і салодкі падарунак.

Дзякуючы паспяховай працы, уседлівасці, жаданню вучыцца Настасся атрымала магчымасць адправіцца ў бліжэйшы час у Нацыянальны аздараўленчы лагер “Зубраня”. Пажадаем ёй насычаных уражанняў!

ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно” 223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
https://berezino2.schools.by/

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц. Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба “Юны журналіст”: Верас Анастасія, Камароўская Ксенія, Мікуцкая Ліза, Сіняк Вікторыя, Швед Анастасія, Чыстап'ян Ульяна, Хасіневіч Марыя і інш.
Рэд. А.Я.Ждановіч